UGDYMO PLĖTOTĖS CENTRAS

## Metodinė medžiaga

***Pagrindinio ugdymo tautinių mažumų gimtųjų kalbų programai įgyvendinti***

# Skaitymo gebėjimų formuojamojo ir diagnostinio vertinimo pavyzdžiai

# baltarusių kalbos 5-6 klasių pamokose

Parengė:
Vilniaus P. Skorinos gimnazijos
baltarusių kalbos  mokytoja Nina Petkevich

Ugdymo plėtotės centro metodininkė
Danuta Szejnicka

2015 m.

# TURINYS

**Grožinio teksto skaitymo vertinimo pavyzdžiai ir kriterijai. ....................................................4**

**Negrožinio teksto skaitymo vertinimo pavyzdžiai. ..................................................................26**

## Tikslas:

Šios metodinės medžiagos parengimo tikslas: mokyti, taikant formuojamąjį vertinimą ir patikrinti ar mokiniai įsisavino teksto suvokimo įgūdžius bei nuostatas: suvokti skaitymą kaip asmeninę prasmingą veiklą; domėtis ir naudotis įvairiais informacijos šaltiniais; siekti pažinti savo, kaip skaitytojo, gebėjimus ir juos tobulinti. Taip pat metodinėje medžiagoje pateikti vertinimo kriterijai bei parodyti formuojamojo vertinimo pavyzdžiai.

**Pasiekimai iš Pagrindinio ugdymo bendrųjų programų 5-6 kl.**

| Gebėjimai | Žinios ir supratimas |
|---|---|
| 2.1. Suprasti artimos vaikų patirčiai, nesudėtingos kompozicijos ir raiškos įvairaus pobūdžio tekstus.<br>2.1.A. Daryti teksto visumą apibendrinančias išvadas: nurodyti aiškiai išreikštą teksto tikslą, temą, pagrindinę mintį, nusakyti nuotaiką.<br>2.1.B. Interpretuoti skaitomus tekstus: paaiškinti nesudėtingas netiesiogiai pasakytas mintis, grožiniame kūrinyje vaizduojamas situacijas, remiantis patirtimi.<br>2.1.C. Aptarti grožinio kūrinio vaizduojamo pasaulio elementus (pvz., veiksmo vietą, laiką, veikėją, veiksmą). Rasti nurodytas kalbinės raiškos priemones ir paaiškinti jų paskirtį.<br>2.1.D. Vertinti tekstų turinį ir raišką: apibūdinti savo įspūdžius, išgyvenimus, vertinti kūrinio veikėjus, jų poelgius, etines pasakų vertybes.<br>2.1.E. Literatūros kūrinius sieti su kitais meno kūriniais (pvz., iliustracijomis, ekranizacijomis).<br>2.3. Sąmoningai skaityti, kontroliuoti savo suvokimą. Apmąstyti savo skaitymo veiklą ir planuoti mokymąsi | 2.1.1. Glaustai atpasakoti tekstą ar jo dalį, neiškreipiant esmės. Rasti nurodytą informaciją tekste.<br>2.1.2. Nurodyti temą, pagrindinę mintį.<br>2.1.3. Skirti autorių, pasakotoją, veikėjus.<br>2.1.4. Aptarti kūrinio veiksmo vietą ir laiką, veikėjus, veiksmą.<br>2.1.5. Atpažinti autoriaus tikslus (pvz., informuoti, paaiškinti, sudominti, įtikinti).<br>2.1.6. Paaiškinti, kuo skiriasi grožinis ir negrožinis tekstas.<br>2.1.7. Skirti eiliuotą ir prozos kalbą.<br>2.1.8. Aptarti kalbinės raiškos priemones (žr. *Turinio apimtis*) ir paaiškinti jų funkcijas konkrečiame tekste.<br>2.1.9. Pavyzdžiais iliustruoti, kuo literatūros kūrinio tikrovė skiriasi nuo gyvenimo tikrovės. Argumentuotai aptarti literatūros kūrinio tikroviškumą: kas primena tikrovę, kas išgalvota.<br>2.1.10. Skirti liaudies ir literatūrinę pasaką, padavimą, mitą, apysaką, eilėraštį, pateikti pavyzdžių.<br>2.1.11. Atpažinti kūrinio žanrą (žr. *Turinio apimtis*).<br>2.1.12. Apibūdinti kūrinyje išreikštus jausmus, nuotaiką, vertybes.<br>2.3.1. Prieš skaitant tekstą, peržvelgti į akis krintančią informaciją (pavadinimą, iliustracijas, lenteles ir pan.).<br>2.3.2. Žinoti skaitymo būdus (atrankinį, pažintinį), nurodyti jų taikymo paskirtį.<br>2.3.3. Siekiant suprasti tekstą, sieti naują |

| | |
|---|---|
| | informaciją su tuo, kas jau žinoma, pažįstama.<br>2.3.4. Žinoti aktyvaus mokymosi metodus, padedančius geriau suprasti skaitomą tekstą: svarbiausių terminų, sąvokų žodynas, teksto žymėjimas sutartiniais ženklais. |

## Santrauka

Metodinė medžiaga aprašo pamokų ciklą pagal V. Karatkevičiaus pasaka „Nemogly bacjka“. Mokiniai įsisavins literatūrinės pasakos ypatumus, skirtumus tarp literatūrinės pasakos nuo liaudės pasakų. Lavins savo įgūdžius teksto analizės, gebėjimus charakterizuoti kūrinio veikėjus ir išskirti kūrinio temą ir idėją. Pamokose būtinai bus pasiūlytos užduotis, kurios padės ugdyti vaiku kūrybinius sugebėjimus. Medžiagoje aprašyti formuojamojo vertinimo budai bei pateikta diagnostinė užduotys, suformuluoti jos vertinimo ir įsivertinimo kriterijai.

**GROŽINIO TEKSTO SKAITYMO**
**VERTINIMO PAVYZDŽIAI IR KRITERIJAI**

**Pasirengimas**

На ўроках беларускай літаратуры вучні V класа ўдасканальваюць навыкі аналізу мастацкага твора, вучацца адрозніваць мастацкі тэкст ад немастацкага, выяўляць пазіцыю аўтара, характарызаваць літаратурных персанажаў. Праверыць разуменне вучнямі мастацкага тэксту дапамагаюць дыягнастычныя тэсты. У дадзеным матэрыяле прыведзены прыклады цыкла ўрокаў асэнсавання літаратурнай казкі і дыягнастычных тэстаў, якія правяраюць здольнасць вучняў разумець мастацкі/немастацкі тэкст (вызначаць тэму твора, галоўных герояў, іх узаемаадносіны і прычыны ўчынкаў, галоўныя падзеі, адносіны аўтара да персанажаў твора). На ўроках выкарыстоўваюцца розныя віды работ, прапаноўваюцца варыянты спосабаў ацэнкі і самаацэнкі.

# Урокі асэнсавання казкі У. Караткевіча

# “Нямоглы бацька”

## Мэты:

- спрыяць спасціжэнню вучнямі ідэі твора, аўтарскай пазіцыі, маральнай высновы казкі У. Караткевіча, яе гуманістычнага пафасу;
- удасканальваць навыкі аналізу мастацкага твора, уменне вучняў характарызаваць герояў паводле іх учынкаў і паводзін;
- развіваць аналітычнае мысленне школьнікаў, творчую актыўнасць, самастойнасць меркаванняў;
- развіваць памяць, назіральнасць, уменне працаваць у групе;
- удасканальваць навыкі вуснага маўлення.

## Этапы працы:

1. **Уступная гутарка**

На мінулым уроку мы з вамі прачыталі казку У. Караткевіча “Нямоглы бацька”. Пішучы свае казкі, У. Караткевіч абапіраўся на народную мудрасць, той жыццёвы вопыт, які набылі і цанілі, якім карысталіся нашы продкі. Пра значэнне жыццёвага вопыту продкаў гаворыць і беларускі пісьменнік А. Пісьмянкоў у сваім вершы, які так і называецца “Продкі”:

Калі марнею ад нягод
І ў сэрцы цесна,
Я ўспамінаю радавод
І продкаў песні.

Яны ідуць за годам год
З мячом і плугам.
О, мой нязводны род,

Ён моцны духам!

Імёны памяць берагла,
Вяла праз церні,
Каб я не сеяў зла,
А толькі зерне.

Да іх іду я зноў і зноў,
Ім веру свята.
Таму й вяду сваіх сыноў
Да іх на раду.

–Перачытайце яшчэ раз апошнюю страфу верша і растлумачыць значэнне слова ***рада.*** **(***Парада, навучанне, нарада*)
– Як вы разумееце гэтыя радкі?
– З якой думкай напісаў аўтар гэты верш? *(З думкай пра сваіх продкаў, іх спрыянне і апеку)*
**Фарміруючае ацэньванне** на дадзеным этапе выражаецца ў славесным адабрэнні, каменціраванні вучнёўскіх адказаў.

2. **Паўтарэнне тэарэтычнага матэрыялу (**Мэта – паўтарыць тэарэтычны матэрыял, які будзе выкарыстоўвацца пры аналізе казкі**)**

**Літаратурны конкурс.** Што лішняе ў запісаным радку? Чаму?

М. Танк. *Ля вогнішч начлежных*

Я. Колас. *Крыніца*

Г. Марчук. *Чужое багацце*

*Залаты птах*

У. Караткевіч. *Нямоглы бацька*

Чым адрозніваецца літаратурная казка ад народнай?

Ці згодны вы з выразам *Казка – добрая падказка*?

Знайдзіце доказы таго, што твор У. Караткевіча "Нямоглы бацька" – казка.
(Зачын: … *быў калісьці – так даўно, што Месяц толькі-толькі з'явіўся на нашым Небе…*
Канцоўка: *І так памёр Закон стары. І так стаў новы Закон.*
Казачныя вобразы: Велікан
Элементы перабольшвання: *нагой ступіць – вада ў след набягае і робіцца стаў; наламаў бярвення; пабудаваў на асіне замак*
Трохразовы паўтор: *кара людзям – неўраджай, напалі суседзі, з'явіўся Велікан*)

Перш чым пачаць гутарку па змесце казкі "Нямоглы бацька", давайце ўспомнім некаторыя пытанні з тэорыі літаратуры, якія спатрэбяцца вам сёння на ўроку, калі вы, працуючы ў групах, будзеце запаўняць крыжаванку. Ацэньвацца ваша праца будзе наступным чынам: (*Кожная група разам з заданнем атрымлівае табліцу з крытэрыямі ацэнкі працы*)

| № | Крытэрыі ацэнкі | Балы |
|---|---|---|
| 1. | Крыжаванка поўнасцю разгаданая, названа зашыфраванае слова. | 4 |
| 2. | Правільна запісана 4 словы, зашыфраванае слова названа. | 3 |
| 3. | Правільна запісана 3 словы, зашыфраванае слова названа. | 2 |
| 4. | Правільна запісана 2 словы, зашыфраванае слова не  названа. | 1 |

**Крыжаванка.**

1. Вуснае мастацкае апавяданне з элементамі выдумкі, фантазіі. (Казка)
2. Трапнае выслоўе, якое дае  вобразную ацэнку падзеям, учынкам, чалавечым якасцям. (Прымаўка)
3. Трапнае народнае выслоўе з павучальным зместам. (Прыказка)
4. Вусная народная творчасць. (Фальклор)
5. Фальклорнае фантастычнае апавяданне, звязанае з гістарычнымі падзеямі.  (Легенда)

– Якое слова атрымалася ў  вертыкальным слупку? (Закон)
– Што такое закон? Як вы разумееце сэнс гэтага слова?

(*Закон – агульнапрыняты звычай, абавязковае правіла, якое павінна выконвацца ўсімі*).

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | к | а | **з** | к | а | | |
| | | п | р | ы | м | **а** | ў | к | а | |
| | | | п | р | ы | **к** | а | з | к | а |
| ф | а | л | ь | к | л | **о** | р | | | |
| | | л | е | г | е | **н** | д | а | | |

**Фарміруючае ацэньванне**: Перш чым падвесці вынікі, настаўнік просіць групы абмяняцца лісткамі з крыжаванкай, пытаецца, які пытанні былі складанымі, а адказы на якія не выклікалі цяжкасцей. Пасля гэтага называюцца правільныя адказы, і групы ацэньваюць працу па прапанаваных крытэрыях.

3. **Праверка засваення вучнямі тэксту**

На дошцы запісаны не па парадку пункты плана казкі “Нямоглы бацька. Аднаўляючы парадак, вучні падыходзяць да настаўніцкага стала, выбіраюць і замацоўваюць на дошцы патрэбны пункт плана, коратка тлумачачы свой выбар.

.

| | |
|---|---|
| 1 | Закон карысці |
| 2 | Спрэчка паміж Пятром і Гнатам |
| 3 | "Прыняў іх чорны лістападаўскі лес" |
| 4 | "Гарыць агонь у лесе" |
| 5 | Парады нямоглага бацькі |
| 6 | "Шануйце нямоглую мудрасць" |

**Фарміруючае ацэньванне:** каментарый настаўніка і вучнёўская ўзаемаацэнка.

4. **Праца над зместам казкі**

– Вакол якіх персанажаў твора разгортваюцца падзеі? (*Бацька, Гнат, Пятро*)
  – Што стала прычынай спрэчкі паміж героямі? (*Закон*)
  – Так, Закон выпрабоўваў герояў. Да чаго ён абавязваў?
  – Як адносіліся да тых, хто трымаўся Закона, і да тых, хто не прытрымліваўся яго?
  – Знайдзіце ў тэксце эпітэты, якія характарызуюць Закон. (*Паганы, дзікі, нялюдскі, жорсткі*)
  – Да чаго ж абавязваў Закон Пятра?
  – Хто напомніў пра Закон Пятру? Зачытайце.
  – Як аднёсся Пятро да напамінку пра Закон? Зачытайце.
  – Ці мог Пятро абысці Закон?
  – Як развітваецца бацька з сынам? Зачытайце.
  – Калі Пятро вёз бацьку ў лес па вёсцы, як глядзелі на іх сустрэчныя людзі? А Гнат? Зачытайце.
  – Як бацька зноў апынуўся ў сваёй хаце? Чаму?
  – Што здарылася ў той год, калі Пятро пераступіў Закон? Зачытайце.
  – Чаму навучыў бацька Пятра?
  – Каму не спадабалася парада?
  – Выпрабаванні не закончыліся. Што здарылася?
  – Як змагаліся з Веліканам?
  – Якую параду даў бацька?
  – Як аднёсся да гэтай парады Гнат?
  – Што здарылася з Веліканам?
  – Чым жа незадаволены Гнат? Зачытайце.
  – Як апраўдаўся Пятро? Зачытайце.
  – Як павёў сябе Гнат?
  – Хто ўмяшаўся ў размову? Зачытайце.
  – Як аднёсся Гнат да таго, што быў парушаны стары Закон?
  – Якое рашэнне прынялі людзі?

**Фарміруючае ацэньванне:** славесная падтрымка актыўнасці вучняў, выдзяленне найбольш поўных правільных адказаў, заахвочванне да выказвання нестандартных, спрэчных поглядаў, каменціраванне недакладных адказаў.

5. **Характарыстыка галоўных персанажаў казкі**

Паганы, дзікі, жорсткі Закон выпрабоўвае герояў казкі. А цяпер давайце крышку пафантазіруем. Уявім, што жыццё – гэта акіян. І раптам у гэты акіян Жыцця ўрываецца Закон і рассяляе нашых герояў па трох астравах: Жорсткасці, Мудрасці, Адвагі. Як вы думаеце, куды хто трапляе? Рассяліце герояў.
*(Востраў Жорсткасці – Гнат, востраў Мудрасці – бацька, востраў Адвагі – Пятро).*

– Адкуль узяліся такія назвы астравоў? *(Адпаведна паводзінам і ўчынкам герояў)*

– Працуючы ў групах, растлумачце, чаму вы менавіта так рассялілі герой казкі. Пры адказе выкарыстоўвайце цытаты з твора, звярніце ўвагу на мову герояў. З пералічаных рыс характару выберыце і запішыце тыя, якія адпавядаюць вобразу, над характарыстыкай якога вы працуеце: *добры, злосны, разумны, грубы, смелы, жорсткі, крыклівы, мудры, міласэрны, уважлівы, кемлівы, бессардэчны, рашучы.* (Кожная група характарызуе адзін вобраз)

Ацэньвацца ваша праца будзе па наступных крытэрыях:

| № | Крытэрыі ацэнкі | Балы |
|---|---|---|
| 1. | Адказы на пытанні правільныя, поўныя, прыведзены цытаты з твора, правільна выпісаны рысы характару кожнага героя. | 4 |
| 2. | Адказы на пытанні правільныя, поўныя, правільна выпісаны рысы характару кожнага героя, але няма цытат. | 3 |
| 3. | Адказы на пытанні правільныя, але няпоўныя, не прыведзены цытаты з твора, не ўсе рысы характару героя названы. | 2 |
| 4. | Адказы на пытанні ў асноўным правільныя, але няпоўныя, не прыведзены цытаты з твора, не названы рысы характару героя. | 1 |

**Фарміруючае ацэньванне:** кожная група прадстаўляе сваю работу. У гэты час іншыя вучні слухаюць, каменціруюць, дапаўняюць, ацэньваюць правільнасць, дарэчнасць прыведзеных прыкладаў, цытат. Настаўнік адзначае ўважлівасць вучняў, іх атыўнасць, уменне аргументаваць сваю думку.

### 6. Вызначэнне ідэі твора

Гутарка настаўніка з вучнямі.

- Якія мудрыя словы сказаў сын у апраўданне перад грамадой? Знайдзіце і зачытайце іх. Як вы разумееце іх сэнс? (*Жылі сілай, а розум забывалі. Жылі сённяшняй карысцю. Знішчалі "ўчора" і таму не мелі права на "заўтра"*)
- Што такое **ўчора**? (*Старыя, мудрыя людзі*)
- Што такое **заўтра**? (*Моладзь, дзеці*)
- Калі ж знішчаць бацькоў, саму мудрасць, што ж застанецца заўтра?
- Падбярыце антонім да слова *светлы (цёмны).*

Пасля гэтага клас разбіваецца на 2 каманды (адна працуе са словам *светлы,* другая – *цёмны*). Да дошкі па чарзе выходзяць па аднаму прадстаўніку кожнай каманды і запісваюць сінонімы да слоў. Перамагае тая каманда, прадстаўнік якой напіша апошняе слова.

| ***Светлы*** | ***Цёмны*** |
|---|---|
| Добры | прагны |
| Спагадлівы | бязлітасны |
| Шчыры | чэрствы |
| Чулы | бяздумны |
| Смелы | жорсткі |
| Сардэчны | злосны |
| Мужны | |

- Назавіце тыя якасці, якія, на вашу думку, характэрны для двух розных тыпаў людзей – "светлага" і "цёмнага".
- Хто з герояў казкі з'яўляецца носьбітам "светлага", а хто – "цёмнага"? Чаму?
- Знайдзіце ў тэксце радкі, у якіх, на вашу думку, заключана ідэя твора? (*Шануйце дабрыню, хай і слабую. Шануйце мудрасць, хай сабе нямоглую. Насіце на руках бацькоў…*)

**Фарміруючае ацэньванне:** настаўнік каменціруе адказы вучняў, адзначае тых, чые адказы найбольш поўныя, аргументаваныя.

## 7. Праца з тэматычна падобнымі творамі

А зараз паслухайце прытчу “Паважай бацьку свайго” і адкажыце, якім чынам яна звязана з тэмай нашага ўрока.

*Жыў аднойчы вельмі стары чалавек. Вочы яго амаль аслеплі, пагоршыўся слых, і рукі дрыжалі. Ён амаль не мог трымаць лыжку і ў час яды часта разліваў суп. Яго родны сын і нявестка пачалі ў час яды садзіць старога за печку, ежу яму падавалі ў старой талерцы. Адтуль стары сумна глядзеў на стол, і вочы яго станавіліся вільготнымі. Аднойчы рукі яго так дрыжалі, што ён не змог утрымаць талерку і тая разбілася. Маладая гаспадыня пачала сварыцца на старога. А той толькі цяжка ўздыхнуў. Тады сын з нявесткай купілі старому драўляную – самую танную з тых, што знайшлі – міску. Цяпер ён павінен быў есці з яе.*

*Аднойчы, калі маладыя бацькі сядзелі за сталом, у пакой увайшоў іх пяцігадовы сын з кавалкам дрэва ў руках.*

*– Што ты будзеш рабіць з гэтым паленам? – спытаў бацька.*

*– Драўляную міску, – адказаў малы. – З яе тата з мамай будуць есці, калі я вырасту.*

- Чаму вучыць гэта прытча?
- Якая з запісаных на дошцы прыказак раскрывае яе сэнс?
- Якія з гэтых прыказак можна суаднесці з тэмай казкі У. Караткевіча “Нямоглы бацька”?

**Запіс на дошцы:**

1. Бацькоў шануй – старых паважай.
2. Як ты шануеш бацькоў, так цябе будуць шанаваць твае дзеці.
3. Шануй бацьку і родную матку.
4. На чужой старане і сонца не так свеціць.
5. Добрыя дзеці бацьку і маці – апора ў хаце.

**Фарміруючае ацэньванне**: настаўнік адзначае актыўнасць вучняў, якія адказваюць на пытанні і тых, хто дапаўняе адказы. Адзначаюцца самыя поўныя і аргументаваныя адказы.

## 8. Творчыя заданні

Праца ў групах: **І-я** група заканчвае фразы (запісаны на дошцы):

- “ Мае бацькі для мяне – гэта…”
- “Няўдзячны сын горш за чужога чалавека, таму што…”

**ІІ-я** група фармулюе новы Закон у выглядзе сінквейна (вучням даецца схема працы над сінквейнам: на *першым* радку запісваецца адно слова – **назоўнік**. Гэта і ёсць тэма сінквейна; на *другім* радку трэба напісаць **два прыметнікі**, якія раскрываюць тэму сінквейна; на *трэцім* радку запісваюцца **тры дзеясловы**, якія апісваюць дзеянні, што адносяцца да тэмы сінквейна; на *чацвёртым* радку размяшчаецца цэлы выраз, **сказ**, які складаецца з некалькіх слоў і з дапамогай якога выказваюцца адносіны да тэмы; а*пошні* радок – гэта **слова-рэзюме**, якое дае новую інтэрпрэтацыю тэмы, дазваляе выказаць да яе асабістыя адносіны).

1. Бацька.

2. Мудры, добры.

3. Гадуе, вучыць, любіць.

4. Дзеці абавязаны шанаваць бацькоў.

5. Абаронца (сябар, жыццё).

Праз 5 хвілін групы мяняюцца заданнямі. Пасля іх выканання абмяркоўваюцца варыянты адказаў.

**Фарміруючае ацэньванне:** настаўнік адзначае лепшыя адказы, дае парады, як палепшыць выкананыя працы. Вучні дзеляцца сваімі ўражаннямі.

**Рэфлексія**

У канцы ўрока настаўнік прапаноўвае вучням запоўніць табліцу, ацэньваючы набытыя веды.

| Этап урока | Адзнака 10-9 Высокі ўзровень | Адзнака 8-6 Базавы ўзровень | Адзнака 5-4 Здавальняючы ўзровень | Адзнака 3-1 Нездавальняючы ўзровень |
|---|---|---|---|---|
| Уступная гутарка | | | | |
| Паўтарэнне тэарэтычнага матэрыялу | | | | |
| Праверка засваення вучнямі тэксту | | | | |
| Праца над зместам казкі | | | | |
| Характарыстыка галоўных персанажаў казкі | | | | |
| Вызначэнне ідэі твора | | | | |
| Праца з тэматычна падобнымі творамі | | | | |
| Творчыя заданні | | | | |

**Дыягнастычнае заданне**

**Užduotis ir vertinimo principai**

У якасці дыягнастычнага задання прапаноўваецца ўрывак з казкі, пасля якога змешчаны пытанні і заданні вучням. У адных выпадках вучні павінны выбраць правільны варыянт адказу; у шэрагу другіх заданняў – адшукаць правільныя адказы ў тэксце і выпісаць іх; некаторыя заданні патрабуюць ад вучняў самастойнай фармуліроўкі адказу. Усе заданні змешчаны пасля тэксту і звязаны з яго зместам.

**У. Караткевіч**
**Нямоглы бацька**
**(урывак)**

Быў калісьці — так, даўно, што Месяц толькі-толькі яшчэ з'явіўся на нашым Небе, — у людзей на зямлі такі паганы звычай: не карміць старых бацькоў.
Дзікія былі людзі. Дзікія-найдзікія. Аж цяпер сорамна ўспамінаць пра іх, такія дзікія. Як убачаць, што маці або бацька больш ахвотна на сонейку грэецца, чым косіць ці жне, дык адразу завозяць іх на калёсах або на санях у глухі лес, пакідаюць трохі ежы і едуць дахаты. А калі тыя хлеб з'ядуць, то або памруць з голаду, або застынуць, або дзікая зверына іх разарве.
Такі быў Закон. І хто Закона трымаўся, таго хвалілі. А хто не трымаўся, таго маглі выгнаць у дзікую пушчу.
Ты пачакай іх да канца вінаваціць. Страшэнна цяжка, у голадзе і холадзе, жылі тыя дзікія людзі. Частыя былі неўраджаі, таму запасаў аніякіх не было і быць не магло. А ўродзіць некалькі гадоў запар — з'явяцца ворагі. І ўжо абы аддай ім, або ляж у сечы. Таму кожныя рукі лічыліся: ці могуць яны яшчэ трымаць касу або меч? А калі ўжо не могуць, калі толькі кавалак да рота нясуць — нашто яны?
Адводзіў чалавек у лес старога бацьку і ведаў: ягоныя дзеці тое самае з ім зробяць. Як ты віншуеш, так табе і дзякуюць. Бо жылі гэтыя людзі па адзіным законе — законе карысці.
Дык вось, жыў сярод тых людзей у адной лясной вёсцы малады чалавек. А імя яму было Пятро.
— Глядзі, — аднойчы сказаў Пятру сусед Гнат, — бацька твой ужо вось-вось пачне кароткай касою ў місцы касіць. Рыхтуйся
— Да чаго? — нібы не зразумеў Пятро.
— Ваўкоў гадаваць.
А Гнат быў адзіны такі на вёску. І было ў таго Гната багата (таксама бедна, але болей, чым у суседзяў, і таму, як воўк за падлу, болей іншых трымаўся ён за Закон), і быў той Гнат самы большы гад. І голас меў у грамадзе.
Зірнуў Пятро на бацьку — сапраўды, у таго рукі-ногі саслабелі, за сахой не пройдуць, лука не нацягнуць. Зусім нямоглы чалавек.
І стала тут Пятру неяк непамысна. Ну нібы выпадкова муху праглынуў. Не ведае, што з ім такое. Проста кепска. А бацька глядзіць на яго і нічога не кажа.
Пятро забыўся на тую размову з суседам, ды надышла восень, і паклікалі яго пад вясковы супольны дуб. Прыйшоў ён, а там ужо грамада шуміць, віруе. І больш за ўсіх каламуціць ваду ў тым віры Гнат. Крычыць, рукамі махае, як малы.
— Чаго марудзіш, Пятро?! — гарлае, аж у вачах туман. — Гані ў лес ваўчыны недаедак.
— Ты чаго гудзіш, як свіння? — раз'ятрыўся на яго Пятро. — Чаго так пільна хочаш? Крыві чужой?
— Згінуў твой стары грыб. А калі згінуў, трэба яго рваць з коранем. А то ад яго і на здаровыя зараза пойдзе.
Грамада сумуе, але хто галасней крычыць, таго і слухаюць.
— Ты гэта, Пятро… таго… — сказаў урэшце другі сусед, Максім. — Ты, значыцца… гэна.

**Заданні, чакаемыя адказы і крытэрыі ацэнкі**

1. 1. Хто з’яўляецца расказчыкам у гэтым тэксце? *Пазнач правільны адказ*.

А. Гнат **В**. Пятро

Б. Аўтар **Г**. Бацька

**Б**. Аўтар

| 0,5 бала за правільны адказ. |
|---|

2. Вызнач тэму ўрыўка.

Тэма гэтага ўрыўка – стары Закон, закон карысці

| 1 бал за правільны адказ. |
|---|

3. Калі адбываліся падзеі, апісаныя ў казцы? *Адкажы словамі тэксту.*

…так, даўно, што Месяц толькі-толькі яшчэ з'явіўся на нашым Небе…

| 1 бал за правільна выпісаную частку сказа. |
|---|

4. Які звычаў панаваў у тыя часы?

У тыя часы быў такі паганы звычай: не карміць старых бацькоў.

| 1 бал за правільны адказ. |
|---|

5. “Жылі па адным законе – законе карысці”. Растлумач значэнне гэтага сказа.

Гэта значыць, што людзі рабілі і цанілі толькі тое, што прыносіла ім карысць. Пытанні маралі іх не хвалявалі.

| 1 бал, калі ў адказе сказана толькі пра карысць ці толькі пра мараль. 2 балы за поўны адказ. |
|---|

6. Якія словы ў казцы сведчаць пра адносіны аўтара да старога Закону?

Паганы звычай, сорамна ўспамінаць

| 0,5 бала за кожнае правільна выпісанае словазлучэнне. |
|---|

7. Як тлумачыць аўтар неабходнасць такога Закону?

Неабходнасць такога закону была выклікана не жорсткасцю людзей, а тым, што часта бывалі неўраджаі, і людзі не маглі зрабіць запасаў, каб не толькі самім пракарміцца, але карміць і тых, хто ўжо не можа ні працаваць, ні абараняць сабранае ад ворагаў.

| |
|---|
| 1 бал, калі сказана толькі пра неўражаі. 2 балы за поўны адказ. |

8. Як ставіліся людзі да таго Закону?

Хто Закона трымаўся, таго хвалілі. А хто не трымаўся, таго маглі выгнаць у дзікую пушчу.

| |
|---|
| 1 бал за правільны адказ. |

9. Дакажы, што сярод жыхароў вёскі спее незадаволенасць старым Законам.

Грамада сумуе, слухаючы, як Гнат патрабуе ад Пятра адвезці старога бацьку ў лес. Сусед Максім разумее, што нельга парушаць Закон, але тое, як няўпэўнена ён гаворыць пра гэта (усе фразы незавершаныя), паказвае яго ўнутраную нязгоду з такім парадкам.

| |
|---|
| 1бал, калі сказана толькі пра рэакцыю грамады ці толькі пра Максіма. 2 балы за поўны адказ. |

10. Растлумач значэнне выразу”Як ты віншуеш, так табе і дзякуюць”.

Як ты ставішся да людзей, так і яны да цябе.

| |
|---|
| 1 бал за правільны адказ. |

11. Якія персанажы супрацьпастаўляюцца ў гэтым урыўку?
Супрацьпастаўляюцца Пятро і Гнат.

| |
|---|
| 1 бал за правільны адказ. |

12. Як ты разумееш словы Гната: ”Рыхтуйся… ваўкоў гадаваць”?

Пакінутых у лесе старых людзей нярэдка разрывалі дзікія звяры. Гэтымі словамі Гнат напамінае Пятру, што час ужо адвозіць бацьку ў лес.

| |
|---|
| 1 бал, калі сказана, што ставалася з пакінутымі ў лесе старымі. 2 балы за поўны адказ. |

13. Чаму Пятро зрабіў выгляд, што не разумее слоў Гната?

Пятро зрабіў выгляд, што не разумее слоў Гната, таму што яму шкада было бацьку.

| |
|---|
| 1 бал за правільны адказ. |

14.Што аўтар расказвае пра Гната? *Выпішы 3 прыклады.*

…было ў таго Гната багата (… і таму, як воўк за падлу, болей іншых трымаўся ён за Закон), і быў той Гнат самы большы гад. І голас меў у грамадзе.

| |
|---|
| 1 бал за кожны правільны прыклад. |

15. Чаму, на думку аўтара, Гнат быў небяспечны?

Гнат быў небяспечны, таму што да яго думкі прыслухоўваліся жыхары вёскі, ён “голас меў у грамадзе”.

| |
|---|
| 1 бал, калі сказана, што да Гната прыслухоўваліся. 2 балы, калі прыведзена цытата. |

16. Як адчувае сябе Пятро пасля размовы з Гнатам? *Адкажы словамі тэксту.*

І стала тут Пятру неяк непамысна. Ну нібы выпадкова муху праглынуў. Не ведае, што з ім такое. Проста кепска.

| |
|---|
| 1 бал за правільна выпісаныя сказы. |

17. Выпішы з тэксту словы, якія Гнат гаворыць пра бацьку Пятра.

Ваўчыны недаедак, стары грыб, рваць з коранем.

| |
|---|
| 0,5 бала за кожнае правільна выпісанае словазлучэнне. |

18. Што мае на ўвазе Гнат, калі гаворыць: “Згінуў … стары грыб. А калі згінуў, трэба яго рваць з коранем. А то ад яго і на здаровыя зараза пойдзе”?

Старым грыбам Гнат называе бацьку Пятра. “Згінуў…” – значыць, стаў стары, нямоглы, ад яго няма ніякай карысці. “трэба … рваць з коранем” – адвозіць у лес. “… на здаровыя зараза пойдзе” – і іншыя перастануць прытрымлівацца Закону.

| |
|---|
| За кожны правільна растлумачаны выраз 1 бал. |

19. Запішы ў табліцу па 3 галоўныя рысы характараў Пятра і Гната.

| Пятро | Гнат |
|---|---|
| Добры | злы |
| Удзячны | чэрствы |
| Смелы | жорсткі |

0,5 бала за кожную правільна названую рысу характару.

20. Дакажы, што гэты твор – літаратурная казка.

Гэта літаратурная казка, таму што ў яе ёсць аўтар.

1 бал за правільны адказ.

| **Сума балаў за заданні 1–20** | **Адзнака** |
|---|---|
| 31-29 | 10 |
| 28-26 | 9 |
| 25-23 | 8 |
| 22-20 | 7 |
| 19-17 | 6 |
| 16-13 | 5 |
| 12-9 | 4 |
| 8-5 | 3 |
| 4-0 | 2 |

# Priedas



*У. Караткевіч*

**Нямоглы бацька**

(*урывак*)



Быў калісьці — так, даўно, што Месяц толькі-толькі яшчэ з'явіўся на нашым Небе, — у людзей на зямлі такі паганы звычай: не карміць старых бацькоў.

Дзікія былі людзі. Дзікія-найдзікія. Аж цяпер сорамна ўспамінаць пра іх, такія дзікія. Як убачаць, што маці або бацька больш ахвотна на сонейку грэецца, чым косіць ці жне, дык адразу завозяць іх на калёсах або на санях у глухі лес, пакідаюць трохі ежы і едуць дахаты. А калі тыя хлеб з'ядуць, то або памруць з голаду, або застынуць, або дзікая зверына іх разарве.

Такі быў Закон. І хто Закона трымаўся, таго хвалілі. А хто не трымаўся, таго маглі выгнаць у дзікую пушчу.

Ты пачакай іх да канца вінаваціць. Страшэнна цяжка, у голадзе і холадзе, жылі тыя дзікія людзі. Частыя былі неўраджаі, таму запасаў аніякіх не было і быць не магло. А ўродзіць некалькі гадоў запар — з'явяцца ворагі. І ўжо абы аддай ім, або ляж у сечы. Таму кожныя рукі лічыліся: ці могуць яны яшчэ трымаць касу або меч? А калі ўжо не могуць, калі толькі кавалак да рота нясуць — нашто яны?

Адводзіў чалавек у лес старога бацьку і ведаў: ягоныя дзеці тое самае з ім зробяць.



Як ты віншуеш, так табе і дзякуюць. Бо жылі гэтыя людзі па адзіным законе — законе карысці.

Дык вось, жыў сярод тых людзей у адной лясной вёсцы малады чалавек. А імя яму было Пятро.

— Глядзі, — аднойчы сказаў Пятру сусед Гнат, — бацька твой ужо вось-вось пачне кароткай касою ў місцы касіць. Рыхтуйся

— Да чаго? — нібы не зразумеў Пятро.

— Ваўкоў гадаваць.

А Гнат быў адзіны такі на вёску. І было ў таго Гната багата (таксама бедна, але болей, чым у суседзяў, і таму, як воўк за падлу, болей іншых трымаўся ён за Закон), і быў той Гнат самы большы гад. І голас меў у грамадзе.

Зірнуў Пятро на бацьку — сапраўды, у таго рукі-ногі саслабелі, за сахой не пройдуць, лука не нацягнуць. Зусім нямоглы чалавек.

І стала тут Пятру неяк непамысна. Ну нібы выпадкова муху праглынуў. Не ведае, што з ім такое. Проста кепска. А бацька глядзіць на яго і нічога не кажа.

Пятро забыўся на тую размову з суседам, ды надышла восень, і паклікалі яго пад вясковы супольны дуб. Прыйшоў ён, а там ужо грамада шуміць, віруе. І больш за ўсіх каламуціць ваду ў тым віры Гнат. Крычыць, рукамі махае, як малы.

— Чаго марудзіш, Пятро?! — гарлае, аж у вачах туман. — Гані ў лес ваўчыны недаедак.
— Ты чаго гудзіш, як свіння? — раз'ятрыўся на яго Пятро. — Чаго так пільна хочаш? Крыві чужой?
— Згінуў твой стары грыб. А калі згінуў, трэба яго рваць з коранем. А то ад яго і на здаровыя зараза пойдзе.
Грамада сумуе, але хто галасней крычыць, таго і слухаюць.
— Ты гэта, Пятро… таго… — сказаў урэшце другі сусед, Максім. — Ты, значыцца… гэна.

1. Хто з’яўляецца расказчыкам у гэтым тэксце? *Пазнач правільны адказ.*

**А**. Гнат **В**. Пятро

**Б**. Аўтар **Г**. Бацька

0,5 бала

2. Вызнач тэму ўрыўка.

……………………………………………………………………………………………………
………………………………………………………………………

1 бал

3. Калі адбываліся падзеі, апісаныя ў казцы? *Адкажы словамі тэксту.*

……………………………………………………………………………………………………
………………………………………………………………………

1 бал

4. Які звычаў панаваў у тыя часы?

…………………………………………………………………………………

1 бал

5. “Жылі па адным законе – законе карысці”. Растлумач значэнне гэтага сказа.

……………………………………………………………………………………………
………………………………………………………………

2 балы

6. Якія словы ў казцы сведчаць пра адносіны аўтара да старога Закону?

……………………………………………………………………………..

1 бал

7. Як тлумачыць аўтар неабходнасць такога Закону?

……………………………………………………………………………………………………
………………………………………………………………………

2 балы

8. Як ставіліся людзі да таго Закону?

………………………………………………………………………………………..

1 бал

9. Дакажы, што сярод жыхароў вёскі спее незадаволенасць старым Законам.
…………………………………………………………………………………………
……………………………………………………………

2 балы

10. Растлумач значэнне выразу”Як ты віншуеш, так табе і дзякуюць”.
……………………………………………………………………………………
……………………………………………………………………………………
………………………………………………

1 бал

11. Якія персанажы супрацьпастаўляюцца ў гэтым урыўку?

……………………………………………………………………………………………

1 бал

12. Як ты разумееш словы Гната: ”Рыхтуйся… ваўкоў гадаваць”?

…………………………………………………………………………………………
…………………………………………………………………………….…………

2 балы

13. Чаму Пятро зрабіў выгляд, што не разумее слоў Гната?

…………………………………………………………………..……………………..

1 бал

14. Што аўтар расказвае пра Гната? *Выпішы 3 прыклады*.

…………………………………………………………………………………………
…………………………………………………………………………………………
…………………………………………………………………………………...……

3 балы

15. Чаму, на думку аўтара, Гнат быў небяспечны?

…………………………………………………………………………………………
……………………………………………………………………..…………………

2 балы

16. Як адчувае сябе Пятро пасля размовы з Гнатам? *Адкажы словамі тэксту.*

…………………………………………………………………………………………………
…………………………………………………………………………………………………
…………………………………………………………………………………………………

1 бал

17. Выпішы з тэксту словы, якія Гнат гаворыць пра бацьку Пятра.

…………………………………………………………………………………………………
…………………………………………………………………………………..……………

1,5 бала

18. Што мае на ўвазе Гнат, калі гаворыць: "Згінуў … стары грыб. А калі згінуў, трэба яго рваць з коранем. А то ад яго і на здаровыя зараза пойдзе"?

…………………………………………………………………………………………………
…………………………………………………………………………………………………
………………………………………………………………………………………………...….

3 балы

19. Запішы ў табліцу па 3 галоўныя рысы характараў Пятра і Гната.

| Пятро | Гнат |
| --- | --- |
| | |
| | |
| | |

3 балы

20. Дакажы, што гэты твор – літаратурная казка.

……………………………………………………………………...……………………………..

1 бал

**NEGROŽINIO TEKSTO SKAITYMO**
**VERTINIMO PAVYZDŽIAI**

**Užduotis ir vertinimo principai**

*Прачытай уважліва тэкст і выканай заданні.*

# Батлейка



Батлейка – беларускі народны лялечны тэатр. Ён вядомы з шаснаццатага стагоддзя. І насіў розныя назвы: яселка, батляемка, жлоб. Часцей за ўсё батлейка паказвалася на калядныя святы.

Як жа выглядала батлейка?



Рабілася вялікая скрынка[1] ў выглядзе хаткі ці вясковай царквы. З дзверцамі замест акон. Вопратку для лялек шылі з тканіны. Валасы, бровы і вусы ў іх былі з лёну, пакулля[2] ці аўчыны. Лялька насаджвалася на драўляны або металічны шпень[3], які рухаўся па проразях у падлозе.

Сцэна аздаблялася тканінай, каляровай паперай, фігуркамі

з тоненькіх палачак і нагадвала балкон, на якім адбывалася дзеянне. На задніку сцэны маляваліся абразы, крыжы, начныя зоркі, лялечныя кампазіцыі на біблейскія тэмы. Батлеечнік знаходзіўся за скрынкай, вадзіў лялькі, гаварыў тэкст, падбіраючы голас персанажа. Нярэдка ён быў не толькі адзіным выканаўцам, але і драматургам, рэжысёрам, мастаком, музыкантам. Батлеечнікі звычайна былі таленавітымі артыстамі-самародкамі.

Многія гады адзінай пастаноўкай была п’еса “Цар Ірад”. Страшны Ірад даведаўся, што нарадзіўся хлопчык, які стане замест яго царом. І ён загадаў забіць усіх хлопчыкаў да трох гадоў. Аднак таго хлопчыка, Ісуса Хрыста, выратавалі пастухі.

Адной такой п’есы было мала. Хацелася нечага весялейшага, бо спектаклі паказваліся звычайна на святы. Каб выклікаць большую цікавасць, батлеечнікі пачалі паказваць камічныя сцэнкі з народнага жыцця. Дасціпныя, перасыпаныя песнямі і танцамі, спектаклі батлейкі ставіліся ўжо і ў будні. З’явіліся новыя персанажы, у якіх людзі пазнавалі саміх сябе, сваіх суседзяў, сваякоў, знаёмых. Гледачы бачылі на сцэне тых, каго і самі не любілі: фанабэрыстага[4] шляхцюка, гультая-п’яніцу, злодзея-прайдзісвета, доктара-шарлатана, хітрага карчмара. Сатырычным героям проціпастаўляўся селянін. Працавіты, кемлівы, вясёлы.

Батлеечнікі вандравалі па ўсёй Беларусі. Іх сустракалі як самых дарагіх гасцей. Асабліва радаваліся дзеці. І гэта зразумела: столькі таямнічага і непаўторнага было ў лялечным тэатры!

З даўніх часоў вядомы батлеечнік Патупчык з Докшыц. У верхняй частцы яго скрыні размяшчаліся два пеўні. Кожны спектакпь пачынаўся іх бойкай і спевамі, інтрыгуючы гледачоў. А сваіх герояў Патупчык капіраваў з натуры. І таму яго батлейку часта ламалі, а сам ён трапляў у няміласць да тых людзей, якіх высмейваў.

З гадамі батлейка мянялася. У пачатку дваццатага стагоддзя ў камічных сцэнках ужо ўдзельнічалі артысты. Называлася гэта відовішча “жывой батлейкай”. І яшчэ болей цешыла людзей, дарослых і дзяцей.

З цягам часу на змену батлейцы прыйшлі прафесійныя тэатры з мноствам выдатных артыстаў.

Але ніводнае сапраўднае мастацтва не можа знікнуць бясследна. У наш час, пасля доўгіх гадоў маўчання, батлейка пачала адраджацца. Хочацца верыць, што яна прыйдзе ў школы і дзіцячыя садкі. І дзень сустрэчы з батлейкаю стане для ўсіх сапраўдным святам! (*Паводле В. Кошаля*)

[1]Скрынка – прадмет, які складаецца з чатырох сценак і днішча.
[2]Пакулле – адходы апрацоўкі льну або канапель
[3]Шпень – стрыжэнь падоўжанай цыліндрычнай ці чатырохграннай формы
[4]Фанабэрысты – пыхлівы, ганарысты

**Пытанні і заданні:**

1. Што такое батлейка?

……………………………………………………………………………………………

1 бал

2. Як яшчэ называлася батлейка?

……………………………………………………………………………………………………

1,5 балы

3. Падбяры сінонім да слова *аздаблялася*.

……………………………………………………………………………………………………..

1 бал

4. Растлумач значэнне слова *батлеечнік*.

…………………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………………

1 бал

5. Выпішы з тэксту 8 слоў, якія адносяцца да тэатральнай лексікі.

…………………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………………

……………………………………………..

4 балы

6. Якія спектаклі прыйшлі на змену п’есе “Цар Ірад”?

……………………………………………………………………………………………………

1 бал

7. Хто быў героем камічных сцэнак з народнага жыцця?

…………………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………………

………………………………………………

2,5 балы

8. Як гледачы сустракалі батлеечнікаў?

……………………………………………………………………………

1 бал

9. Хто і чаму асабліва радаваўся прыходу батлеечнікаў?

…………………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………………

1 бал

10. Растлумач прычыну папулярнасці батлеечніка Патупчыка. Чаму яго батлейку часта ламалі?

…………………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………………

2 балы

11. Што такое “жывая батлейка”?

…………………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………………

1 бал

12. На тваю думку, чаму батлейка не вытрымала канкурэнцыі з прафесійным тэатрам?

…………………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………………

………………………………………………………………………………………………
……………………………………………………………………………………………..

2 балы

13. Вызнач галоўную думку апошняга абзаца.

………………………………………………………………………………………………
……………………………………………………………........................................……

1 бал

14. Дакажы, што гэты тэкст не мастацкі. Прывядзі два аргументы.

………………………………………………………………………………………………
………………………………………………………………………………………………
…………………………………………......................................................................

2 балы

15. Якія яшчэ віды тэатраў, акрамя лялечнага, ты ведаеш?

………………………………………………………………………………………………
…………………………………………………………………................................................

3 балы

**Чакаемыя адказы:**

1. 1. Што такое батлейка?
   **Батлейка – гэта беларускі народны лялечны тэатр.**
   1бал
2. Як яшчэ называлася батлейка?
   **Батлейка мела яшчэ і іншыя назвы: яселка, батляемка, жлоб.**

   1,5 балы
3. Падбяры сінонім да слова *аздаблялася*.
   ***Упрыгожвалася.***

   1 бал
4. Растлумач значэнне слова *батлеечнік*.
   ***Батлеечнік – гэта артыст, які ўдзельнічаў у батлеечных спектаклях, кіраваў кукламі.***

   1 бал
5. Выпішы з тэксту 8 слоў (у назоўным склоне), якія адносяцца да тэатральнай лексікі.
   ***Афіша, тэатр, сцэна, выканаўца, драматург, рэжысёр, артыст, спектакль.***

   4 балы
6. Якія спектаклі прыйшлі на змену п’есе “Цар Ірад”?
   ***На змену п’есе “Цар Ірад” прыйшлі камічныя сцэнкі з народнага жыцця.***

   1 бал
7. Хто высмейваўся ў камічных сцэнках з народнага жыцця?
   ***Высмейваліся фанабэрысты шляхцюк, гультай-п’яніца, злодзей-прайдзісвет, доктар-шарлатан, хітры карчмар.***

   2,5 балы
8. Як гледачы сустракалі батлеечнікаў?
   ***Іх сустракалі як самых дарагіх гасцей.***

   1 бал

9. Хто і чаму асабліва радаваўся прыходу батлеечнікаў?
***Асабліва радаваліся дзеці, таму што шмат таямнічага і непаўторнага было ў лялечным тэатры.***

1 бал

10. Растлумач прычыну папулярнасці батлеечніка Патупчыка. Чаму яго батлейку часта ламалі?
***Спектаклі Патупчыка арыгінальна пачыналіся – бойкай і спевамі пеўняў. Сваіх герояў Патупчык капіраваў з натуры, таму ўсе іх адразу пазнавалі. І тым, з каго смяяліся, гэта было вельмі непрыемна, па гэтай прычыне яго батлейку часта ламалі, а сам ён трапляў у няміласць да тых людзей, якіх высмейваў.***

2 балы

11. Што такое "жывая батлейка"?
***"Жывая батлейка" – гэта калі ў камічных сцэнках ролі выконваліся артыстамі, а не лялькамі.***

1 бал

12. На тваю думку, чаму батлейка не вытрымала канкурэнцыі з прафесійным тэатрам?
***Батлейка не вытрымала канкурэнцыі з прафесійным тэатрам, магчыма, таму, што батлеечнік быў адначасова і драматург, і рэжысёр, і акцёр і да т.п. – ён павінен быў спалучаць у сабе таленты многіх людзей. А ў прафесійным тэатры кожны робіць сваю частку работы, і таму спектакль атрымліваецца цікавейшым, больш відовішчным.***

1 бал

13. Вызнач галоўную думку апошняга абзаца.
***Галоўная думка апошняга абзаца – вера ў тое, што батлейка адродзіцца і будзе прыносіць задавальненне сучасным гледачам.***

1 бал

14. Дакажы, што гэты тэкст не мастацкі. Прывядзі два аргументы.
    1. ***У тэксце няма мастацкага вымыслу.***
    2. ***У тэксце расказваецца толькі пра тое, што рэальна існавала.***
    3. ***Адсутнічаюць сродкі мастацкай выразнасці.***
    4. ***Задача аўтара – інфармаваць, а не ўздзейнічаць эмацыянальна, задавальняць эстэтычныя патрэбы.***

2 балы

15. Якія яшчэ віды тэатраў, акрамя лялечнага, ты ведаеш?
***Драматычны, музычнай камедыі, оперы і балета, пантамімы і інш.***

3 балы

| **Сума балаў за заданні 1–15** | **Адзнака** |
|---|---|
| 25-24 | 10 |
| 23-21 | 9 |
| 20-18 | 8 |
| 17-15 | 7 |
| 14-12 | 6 |
| 11-10 | 5 |
| 9-8 | 4 |
| 7-5 | 3 |
| 4-0 | 2 |